## PRO-КУЛЬТУРА

Нэлі РАДЗЬКО

# #ВЫСТАВА



***Дзіцячая мастацкая школа імя І. Ф. Хруцкага працягвае серыю арт-праектаў, прысвечаных 215-годдзю з дня нараджэння выбітнага беларускага жывапісца, прозвішча якога з гонарам носіць установа.***

На мінулым тыдні ў Полацкім дзяржуніверсітэце імя Еўфрасінні Полацкай адкрылася выстава па выніках Міжнароднага пленэру-конкурсу юных мастакоў «Палітра Прыдзвіння». Асаблівасць новай экспазіцыі ў тым, што на ёй прадстаўлены пераважна нацюрморты, напісаныя лепшымі навучэнцамі школ з усёй Беларусі, а таксама замежных краін. Натхненнем для іх служылі работы самога майстра – Івана Хруцкага.



Шмат шчырых слоў юным талентам падчас адкрыцця адрасавала дырэктар ДМШ Аксана Тарасікава і госць урачыстасці – член Беларускага саюза мастакоў, старшы выкладчык кафедры архітэктуры і дызайну ПДУ, Ганаровы грамадзянін Наваполацка Віктар Лук'яненка, а таксама педагогі і бацькі пачынаючых аўтараў.



Паспрабаваць сябе ў ролі творцы змаглі ўсе прысутныя – выкладчык школы Алена Карпава запрасіла гледачоў разам стварыць копію з рэпрадукцыі Івана Фаміча «Кветкі і плады». Музычных адценняў мерапрыемству дадало выступленне трыа акардэаністаў «Зорачкі» дзіцячай школы мастацтваў № 1.